**УДК [94+347.64](476-89)(091)“17/18”**

# АРГАНІЗАЦЫЯ І ДЗЕЙНАСЦЬ ДВАРАНСКІХ АПЕК У БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ У КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

*Пышкала К. Р.*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле разгледжана арганізацыя і дзейнасць дваранскіх апек у беларуска-літоўскіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. Усталявана, што дваранскія апекі з’яўляліся дзяржаўнымі інстытутамі ўнутрысаслоўнай апекі для дваранства, развіццё якіх пачалося з зацверджаных імператрыцай Кацярынай II у 1775 г. «Учреждений для управления губерний Всероссийской империи». Параўноўваюцца прававыя нормы функцыянавання дваранскіх апек з практыкай. На аснове дакументаў вылучаны асноўныя кірункі дзейнасці дваранскіх апек. Выяўлена, што галоўнымі прычынамі ўзяцця дваранскай маёмасці пад апеку ў беларуска-літоўскіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. былі малалецтва дваранскіх сірот і даўгі.*
***Ключавыя словы:*** *дваранская апека; апека; апякун; дваранства; сіроты.*

# THE ORGANIZATION AND ACTIVITY OF NOBLE CUSTODY IN THE BELARUSIAN-LITHUANIAN PROVINCES IN THE LATE XVIII – FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

*Pyshkala E. G.*
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus
Minsk, Belarus

***Abstract.*** *The article examines the organization and activities of noble guardianships in the Belarusian-Lithuanian governorates in the late 18th – first half of the 19th century. It is established that noble guardianships were state institutions of intra-estate guardianship for the nobility. Their development began with the «Institutions for the Management of the Governorates of the All-Russian Empire» approved by Empress Catherine II in 1775. The article compares the legal norms of the functioning of noble guardianships with practice. On the basis of the documents, the main areas of activity of noble guardianships are highlighted. It is revealed that the main reasons for taking noble property under guardianship in the Belarusian-Lithuanian governorates in the late 18th – first half of the 19th century were the minority of noble orphans and debts.*
***Keywords:*** *noble guardianship; guardianship; guardian; nobility; orphans.*

У Расійскай імперыі ў XVIII ст. пачаўся працэс зараджэння дзяржаўнай апекі над уразлівымі катэгорыямі насельніцтва. У гэтым працэсе

немалаважная роля была аддадзена развіццю ўнутрысаслоўнай апекі. Паводле заканадаўчага акта імператрыцы Кацярыны II ад 4 лістапада 1775 г. «Учреждения для управления губерний Всероссийской империи», для дваранскага саслоўя і гарадскіх абывацеляў ствараліся дваранскія апекі і сіроцкія суды адпаведна. Гэтыя ўстановы першапачаткова павінны былі займацца апекай над удовамі і сіротамі [1, с. 247]. Пасля далучэння беларуска-літоўскіх губерняў да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. дваранскія апекі сталі засноўвацца і на новадалучаных тэрыторыях.

Паводле закона 1775 г., дваранскія апекі засноўваліся ў паветах Расійскай імперыі пры павятовых судах. Старшынёй быў павятовы прадвадзіцель дваранства, акрамя яго, у склад органа павінны былі ўвайсці павятовы суддзя і дваранскія засядацелі суда [1, с. 232, 247]. На практыцы склад «присутствия» ў дваранскай апецы мог быць меншы. На пасяджэнні дваранскай апекі Віцебскага павета 1 студзеня 1836 г., напрыклад, прысутнічалі як віцебскі павятовы прадвадзіцель дваранства, так і суддзя і засядацель Віцебскага павятовага суда [2, арк. 1]. Фармальна выканаўшы патрабаванне закона, Віцебская дваранская апека, такім чынам, прытрымлівалася мінімальнай колькасці членаў апекі, уключыўшы ў свой склад толькі аднаго засядацеля павятовага суда. У такім жа складзе засядала Дрысенская дваранская апека 1 красавіка 1857 г. [3, арк. 1]. Але нават гэты склад, прапісаны ў дакументах, мог не супадаць з рэчаіснасцю. У той жа Дрысенскай дваранскай апецы ў 1858 г. сярод іншых спраў разглядалі і прынялі да ведама прапанову дрысенскага павятовага прадвадзіцеля дваранства «о считании его по делам своим и журналам присутствующим» [4, арк. 7].

Імператарскім указам ад 9 верасня 1801 г. у штат дваранскіх апек уводзілася пасада пратакаліста [5]. Паводле дакументаў, у 1855 г. у Пружанскай дваранскай апецы канцылярыя складалася з пісьмавода, журналіста і пісара. Усе яны атрымлівалі заробак: пісьмавод 1 класа – 250 рублёў, журналіст – 150, а пісар – 120 рублёў у год [6, арк. 18]. У канцылярскі штат Кобрынскай дваранскай апекі за той жа 1855 г. уваходзілі пісьмавод з заробкам 250 рублёў і тры пісары, кожнаму з якіх плацілі ў год 90 рублёў [6, арк. 29].

Першапачаткова дваранскія апекі павінны былі ствараццa пры кожным верхнім земскім судзе (інстанцыя, якая з’яўлялася губернскім судом для дваранства) на базе павятовага суда. Дваранскія апекі падпарадкоўваліся верхнім земскім судам, а таксама губернскім праўленням і выконвалі ўказы і загады ад абодвух органаў [1, с. 290].

Пасля скасавання верхніх земскіх судоў дваранскія апекі з 1801 г. сталі падпарадкоўвацца губернскім палатам грамадзянскага суда [5], да якіх адыходзіла функцыя апеляцыі рашэнняў дваранскіх апек.

Пасяджэнні дваранскай апекі мусілі праходзіць тры разы на год адначасова з пасяджэннямі павятовага суда [1, с. 247–249]. На практыцы пасяджэнні дваранскіх апек адбываліся значна часцей, чым прадпісваў закон. Праца органа вялася круглагадова: пры паступленні новых спраў, прашэнняў і рапартаў.

Пытанне фінансавання дваранскіх апек было агаворана ў сенацкім указе ад 16 студзеня 1835 г.: «Как Дворянския Опеки учреждены для дел собственно дворянскаго сословия, то и увеличение содержания Канцелярий оных должно относить на одни дворянския имения» [7]. У зацверджаным Мікалаем I 28 красавіка 1836 г. палажэнні Камітэта міністраў грошы з дваранскіх маёнткаў рэкамендавалася браць «тем же порядком, как и сбор на содержание Канцелярий Дворянских Депутатских Собраний и Предводителей». А менавіта ўносіць графу выдаткаў у прыватныя земскія павіннасці памешчыцкіх сялян [8]. Аднак сабраных грошай не заўжды хапала на належнае фінансаванне дваранскіх апек. У прыватнасці, на гэта ў кастрычніку 1850 г. у канцылярыю Віцебскага грамадзянскага губернатара паступілі скаргі адразу ад некалькіх дваранскіх апек – Лепельскай, Веліжскай, Гарадзецкай [9, арк. 1–1 адв., 10].

Працэс усталявання апекі пачынаўся з паведамлення дваранскай апецы пра ўдоў ці дваранскіх дзяцей, якія засталіся без бацькоў у канкрэтным павеце [1, с. 247–248]. Праца дваранскіх апек уключала ў сябе некалькі паслядоўных этапаў: прызначэнне апекуноў, вопіс з іх удзелам маёмасці памерлага, кантроль за апекунамі праз справаздачы, якія трэба было падаваць у дваранскую апеку штогадова. Асобна ва «Учреждении о губерниях» прапісваліся правілы апекі над удовамі. Ім апекуны прызначаліся толькі па іх жаданні, а дваранская апека абавязвалася адстойваць іх маёмасныя інтарэсы ў судзе і прадастаўляць ім бясплатныя паслугі стрАпчых [1, с. 248].

Апекунамі было прадпісана прызначаць перш за ўсё тых, каго вызначалі ў тэстаментах памерлыя бацькі. Калі бацькі не вызначылі апекуноў, то іх прызначэннем займалася дваранская апека [1, с. 247–248]. Асобны 221 артыкул XVI главы «Учреждений о губерниях» – «Примерное, или повальное наставление опекунам» – акрэсліваў сутнасць здзяйснення апекі, а таксама ўтрымліваў рэкамендацыі да апекуноў ад дваранскай апекі. За сваю працу апякун мог прэтэндаваць на 5 % даходаў з маёнтка штогод (але калі апекуноў было некалькі, сума дзялілася паміж

імі). Апека спынялася «по совершеннолетии малолетнаго» (17 гадоў), і ў гэты год апекуны абавязаны былі прадаставіць апошнюю справаздачу дваранскай апецы [1, с. 249–251]. Даследчыкі адзначаюць, што прынятага заканадаўствам узнагароджання было недастаткова, каб зацікавіць дваран, і гэта часта выклікала іх нежаданне рабіцца апекунамі [10, с. 9].

На працягу здзяйснення апекі над асобай або маёнткам апекуны знаходзіліся пад наглядам дваранскіх апек, якія маглі адхіліць іх ад пасады за неналежнае выкананне абавязкаў. Так, у Давід-Гарадокскай дваранскай апецы ў 1796 г. узнікла праблема растраты апекунамі сродкаў падапечнага. У пратаколе пасяджэння дваранскай апекі ад 12 мая 1796 г. было запісана: «[по сообщению] господина дворянского предводителя <…> и ордена св. Станислава кавалера Иосифа Щита <…> проживавших здешней округи <…> малолетных Адама и Антония Юнкевичев свойственники, там же жительствующие шляхтичи Вербицкий с женою и каморник Енисей делают усилие в расточении движимого и недвижимого их малолетних имения <…>. По Генеральному о губернии учреждению и по предписанию главного правительства к таковым повелено определять опекунов, посему и приказали: к имению поназванных малолетних Енисевичев, выбрав состояния доброго, исправного, из дворян опекуна [назначить], [а] реченных шляхтичей Вербицкого с женою и каморника Енисевича выслать в оную опеку в непродолжительном времени» [11, арк. 37–37 адв.]. Дваранская апека не канцэнтравалася на прыцягненні апекуноў да адказнасці за супрацьпраўныя дзеянні на пасадзе (гэтая функцыя заставалася за судовымі ўстановамі), але прызначала іншых апекуноў згодна са сваім меркаваннем.

Уяўленне пра напрамкі дзейнасці дваранскіх апек даюць загалоўкі апякунскіх спраў у вопісах, складзеных у канцылярыях саміх устаноў. У такіх вопісах Магілёўскай дваранскай апекі за 1829–1860 гг. пераважалі справы пра апеку над маёнткамі малалетніх дваран: дзяцей памерлага калежскага саветніка Круза, малалетніх Шалыгіных, Любові Каральковай, дзяцей тытулярнага саветніка Льва Бекарэвіча, двараніна Антона Савіцкага і інш. [12, арк. 1–19 адв.]

Прызначаліся папячыцелі дваранкам – паўналетнім дзяўчынам і ўдовам [12, арк. 1–19 адв.]. Пасада папячыцеля законам адасаблялася ад пасады апекуна. Папячыцеляў прызначалі, напраклад, да дасягнення поўнага паўналецця ў 21 год. Згода папечыцеля патрабавалася на продаж і іншыя грашова-маёмасныя аперацыі: «делать долги, давать письменные обязательства и совершать акты и сделки» [13, с. 42]. Таксама папячыцель прызначаўся ўдаве па яе жаданні.

Значнае месца ў працы дваранскіх апек займалі справы аб апецы маёнткаў і маёмасці дваран за даўгі. Адразу некалькі маёнткаў у Магілёўскім павеце ў 1829 г. знаходзіліся пад апекай праз нявыплату доўга банку па 8-гадовым займе [12, арк. 1–19 адв.].

Пад апеку браліся таксама маёнткі з фармулёўкай «за жестокие поступки владельцев». У 1836 г. у канцылярыю мінскага губернатара павятовыя дваранскія апекі даслалі свае ведамасці пра такія маёнткі. Так, Бабруйская дваранская апека вяла справу пра апеку над маёнткам Язафата Усцінавіча Палубінскага «по жестокому обращению с крестьянами и развратному поведению владельца» [14, арк. 11]. Ігуменская дваранская апека трымала пад наглядам і апякунскім кіраваннем маёнтак Гарадок памешчыка Ігнація Выгоцкага за «жестокое обращение с крестьянами» [14, арк. 14]. А Слуцкая дваранская апека дала інфармацыю, што пад апекай у 1836 г. па гэтай жа прычыне знаходзіўся былы слуцкі межавы суддзя Іосіф Дукшынскі са сваёй жонкай Кларай [14, арк. 21].

Штогадовыя справаздачныя ведамасці дваранскіх апек адлюстроўвалі колькасць заведзеных у іх ведамстве спраў па розных кірунках. Так, у Кобрынскай дваранскай апецы ў 1855 г. колькасць апек над малалетнімі і іх маёмасцю ў павеце складала 51, «по спору наследников» – 19, «неосторожных должников» – 52, «по злоупотреблению помещичьей властью» – 2 [6, арк. 28]. У Ваўкавыскай дваранскай апецы большую частку спраў таксама заводзілі «по малолетству» – 28, па спрэчках паміж спадкаемцамі – 2, «неосторожных должников» – 10 і па злоўжыванні памешчыцкай уладай – 2 [6, арк. 45]. У Бельскай дваранскай апецы таксама пераважалі справы «по малолетству»: іх было заведзена 97, па спрэчках спадкаемцаў маёнтка – 2, «неосторожных должников» – 63. Апека накладалася на маёнткі і па іншых прычынах: 1 справа вялася па апецы «расточительных» дваран, а 9 – асоб, «лишенных дворянства» [6, арк. 68]. У апошнім выпадку ўяўляе цікавасць, што маёнткі такіх асоб належалі да ведамства дваранскіх апек, а не іншых установаў, што можа быць звязана з імкненнем захаваць дваранскую маёмасць.

Сярод апякунстваў Брэсцкай дваранскай апекі «по малолетству» было заведзена 24 справы, «по спору наследников» – 3, «неосторожных должников» – 1 і «по злоупотреблению помещичьей властью» – 2. Адна справа вялася па катэгорыі «помешательство в уме» [6, арк. 77]. У Слонімскай дваранскай апецы, у адрозненне ад іншых паветаў, большая частка спраў па апецы была заведзена праз «неосторожных должников» – 47. «По малолетству» вялося 30 спраў, «по спору наследников» –

2, пра злоўжыванне памешчыцкай уладай – 1 і пра пазбаўленне дваранскіх правоў – 1 [6, арк. 70].

Дзейнасць дваранскіх апек, як і іншых дзяржаўных органаў у Расійскай імперыі, перыядычна падлягала рэвізіі з боку кантралюючых інстанцый. У 1832 г. увагу віцебскага грамадзянскага губернатара прыцягнула вядзенне справаводства ў дваранскай апецы Віцебскага павета. 3 сакавіка 1832 г. з упраўлення генерал-губернатара Смаленскага, Віцебскага, Магілёўскага і Мінскага ў канцылярыю віцебскага грамадзянскага губернатара паступіў ліст, у якім было сказана: «Витебский губернский прокурор <…> донёс мне, что Витебский уездный стряпчий, по обязанности своей бывая ежедневно в Витебской дворянской опеке, требовал к разсмотрению своему докладных реестров или журналов и нашёл, что <…> дела не имеют должного течения. <…> Г. предводитель, хотя приказал иметь себя присутствующим, но в присутствии почти никогда не бывает, чрез что приготовленные для отсылки в Гражданскую Палату отчёты опеки лежат без действия более двух недель, а состоящие в ведомстве ея имения остаются без опекунов. Кроме того, поступающие в опеку бумаги не бывают им, стряпчим, просматриваемы оттого, что предводитель берёт их к себе в квартиру и удерживает там по произволу» [15, арк. 1–1 адв.].

Акрамя таго, меліся заўвагі па вядзенні справаводства [15, арк. 12]. Сярод іх была нестандартная заўвага прадвадзіцелю дваранства Віцебскага павета Любашчынскаму (які адначасова займаў пасаду старшыні павятовай дваранскай апекі). Той у журналах пасяджэнняў і пратаколаў побач з рашэннямі па справах «делал приписки карандашом, с замечанием насчёт членов опеки» [15, арк. 12 адв.]. Не ўдакладнялася, якія менавіта гэта былі заўвагі, але можна выказаць меркаванне, што Любашчынскі ацэньваў працоўныя здольнасці іншых членаў дваранскай апекі або іх асабістыя якасці.

Рэвізія, якая закранула ў 1851 г. Полацкую дваранскую апеку, таксама выявіла падобныя недахопы. Павятовы страпчы зрабіў заўвагі па вядзенні спраў: некаторыя неабходныя кнігі і журналы не былі заведзены ці вяліся недасканала, апекуны марудзілі са справаздачамі, а дваранскія апекі ніяк не прымушалі іх паскорыць здачу дакументацыі. У заўвагах рэвізора адлюстроўваліся паўсядзённыя аспекты працы дваранскх апек: «Самая Дворянская Опека помещается в одной камере с канцеляриею уездного суда тесно, занимается ныне письмоводитель один всем канцелярским производством» [16, арк. 2–3 адв.]. З гэтага бачна, што ў Полацкай дваранскай апекі (магчыма, што і ў іншых павятовых апек) не было

асобнага памяшкання, і фармулёўка з заканадаўства «Дворянская Опека состоит при каждом Уездном Суде» [17, с. 781] на практыцы магла разумецца літаральна, калі пасяджэнні і праца канцылярыі апекі зліваліся з дзейнасцю павятовага суда.

На працягу 80 гадоў з заснавання паўнамоцтвы дваранскіх апек былі афіцыйна пашыраны. У Зводзе законаў Расійскай імперыі 1857 г. выдання было прапісана: «Дворянской Опеке принадлежит: 1) попечение о малолетних сиротах и вдовах дворянского состояния, и об имении их и делах; 2) ведомство дворянских имений, секвестрованных по казённым взысканиям и другим законным постановлениям; 3) ведомство дворянских имений, состоящих в споре по духовным завещаниям» [17, с. 781].

Такім чынам, дваранскія апекі ў беларуска-літоўскіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. з'яўляліся дзяржаўнымі інстытутамі ўнутрысаслоўнай апекі для асоб дваранскага саслоўя, якія засноўваліся як павятовыя інстанцыі па агульным для ўсёй Расійскай імперыі ўзоры. Цесна звязаныя з павятовымі судамі, яны складаліся з павятовага прадвадзіцеля дваранства, суддзі і засядацеляў павятовага суда таго павета, на які распаўсюджвалася іх юрысдыкцыя.

Паводле заканадаўства апека накладалася на ўдоў і сірот дваранскага паходжання, на секвестраваныя ў казну маёнткі і на маёнткі, праз якія ўзнікалі спрэчкі паміж спадкаемцамі пасля смерці ўладальніка. На практыцы функцыі дваранскіх апек былі шырэйшыя: апека прызначалася над маёнткамі дваран-вар'ятаў, недзеяздольных у выніку цяжкіх хвароб, дваран-даўжнікоў, банкрутаў, за злоўжыванні памешчыцкай уладай (мелася на ўвазе жорсткае абыходжанне з сялянамі), а таксама на маёнткі асоб, пазбаўленых дваранства. Як паказваюць дакументы, у беларуска-літоўскіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. пераважала апека над маёнткамі малалетніх дваран і даўжнікоў.

Накладанне апекі пасля смерці двараніна над удавой ці сіратой складалася з некалькіх паслядоўных этапаў: паведамленне і прашэнне пра ўзяцце пад апеку, прызначэнне апекуна, вопіс маёмасці памерлага, кантроль за апекуном праз штогадовыя справаздачы. Пры злоўжываннях апекуноў дваранскія апекі валодалі паўнамоцтвам адхіліць іх ад пасады і прызначыць іншых, але збор доказаў і пакаранне за злачынныя дзеянні былі прэрагатывай судовых устаноў.

Практычная дзейнасць дваранскіх апек часам разыходзілася з заканадаўчымі нормамі. Існавала тэндэнцыя да скарачэння складу апекі, аптымізацыі канцылярыі. Фінансаванне органа павінна было адбывацца

за кошт дваранскіх унёскаў, але на практыцы існавалі праблемы як з недахопам грошай, так і маруднасцю іх дастаўлення. Перыядычныя рэвізіі выяўлялі падобныя праблемы ў працы розных павятовых дваранскіх апек: хібы ў вядзенні канцылярскай дакументацыі, адсутнасць па некаторых справах апякунскіх справаздач, зацягванне разгляду спраў.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Полное Собрание Законов Российской Империи (далей – ПСЗРИ): Собрание первое: [С 1649 по 12 декабря 1825 г.]. – Санкт-Петербург: Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е.И.В. канцелярии, 1830. – Т. 20. – № 14392. – С. 229–304.

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2549. Воп. 1. Спр. 8.

3. НГАБ. – Ф. 2659. Воп. 1. Спр. 19.

4. НГАБ. – Ф. 2659. Воп. 1. Спр. 23.

5. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 26. – №. 20004. – С. 775–778.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 5. Спр. 1776.

7. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 10, ч. 1. – №. 7767. – С. 47.

8. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 11, ч. 1. – №. 9116. – С. 455.

9. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 21763.

10. *Кормчина, Е. С.* Институт дворянской опеки в Рязанской губернии в конце XVIII – первой половине XIX века / Е. С. Кормчина // Труды Исторического факультета Санкт-Петербургского университета. – 2012. – № 9. – С. 7–13.

11. НГАБ. – Ф. 693. Воп. 1. Спр. 6.

12. НГАБ. – Ф. 2072. Воп. 2. Спр. 15.

13. Свод законов Российской империи (СЗРИ) [повелением Государя императора Николая Павловича составленный]. – Санкт-Петербург, 1857. – Т. 10. Ч. 1. Законы гражданские. – 1857. – 491 с.

14. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 564.

15. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3278.

16. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 22252.

17. СЗРИ. – Санкт-Петербург, 1857. – Т. 2. Ч. 1. Общее учреждение губернское. – 1857. – 1474 с.